


# САВІЦКІ
# МІХАІЛ АРХІПАВІЧ



Нарадзіўся ў 1919 годзе ў в. Філістава Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1939 года. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг. У Вялікую Айчынную вайну ў якасці радавога ваяваў у 18 франтавым запасным аўтамабільным палку 51 гвардзейскага стралковага палка. З лістапада 1944 года служыў у 202 запасным стралковым палку, 1860 эвакуацыйным шпіталі.

Узнагароджаны медалямі “За адвагу”, “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.”, “За ўзяцце Кёнігсберга”, ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Выпіска з узнаградного ліста ад 18 мая 1945 года за подпісам камандзіра 18 аўтапалка падпалкоўніка Кожура: “…при выполнении задания командования при наведении для корректировки огня артиллерии был тяжело ранен, но не бросил работу до тех пор, пока не выполнил задание… Достоин правительственной награды – медали “За отвагу”.

Пасля вайны пражывў з сям’ёй у в. Марцюхова Талачынскага раёна, працаваў на спіртзаводзе ў в. Гаршчэўшчына, потым у мясцовым саўгасе.

Памёр у 1998 годзе.

**Крыніцы інфармацыі:**

1. **Памяць народа**: сапраўдныя дакументы аб Другой сусветнай...: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : pamyat-naroda.ru.

2. **Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Савіцкі Міхаіл Архіпавіч**: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : 1418museum.ru›heroes/27333394/.